# Рапорт жакардавага ўзору на тканінах XVI–XVIII стст. у святле сучасных тэхналогій

Сучасныя тэхналогіі – у выглядзе і тэхналагічнага абсталявання, і праграмных прадуктаў – стала ўвайшлі ў нашую штодзённасць. Сёння ўжо немагчыма ўявіць практычна ніводны вытворчы працэс без іх. Разам з тым яны не толькі робяць больш камфортным наша паўсядзённае жыццё, але і могуць дапамагчы ў такіх, здавалася б, традыцыйных рукатворных галінах чалавечай дзейнасці, як стварэнне шаўковых дэкаратыўных узорыстых тканін.



**Андрэй Шулаеў,**
аспірант
Рэспубліканскага
інстытута вышэйшай
школы

## Рапорты ўзорыстых тканін XVI–XVIII стст.

Асноўныя характарыстыкі ўзорыстай тканіны – яе колер і ўзор, чыёю асновай выступае рапорт.

Рапорт (фр. *rapport*, ад *rapporter* – «вяртаць назад») – базавы элемент арнаменту, частка ўзору, што паўтараецца шматкроць на тканіне, трыкатажы, дыване, шпалерах і г.д. Узор мог выконвацца ў тэхніках ткацтва, вышыўкі, фарбавання, ціснення.

У дадзеным даследаванні мы будзем весці гаворку перадусім пра рапорты жакардавых узораў шаўковых тканін XVI–XVIII стст.

Само слова «жакард», ці «жакардавая тканіна», ужыванае для пазначэння тканіны з рэльефнымі ўзорамі, што вытканыя ў працэсе яе вырабу, а не надрукаваныя ці вышытыя на ёй, насамрэч куды больш позняе за самую тэхналогію стварэння такога вырабу. Тэхналогія жакардавага пляцення заключаецца ў перапляценні нітак асновы ды нітак уточных пад простым вуглом адно да аднаго на рамцы станка; дэкаратыўны ўзор ствараецца шляхам прапускання ніткі (групы нітак) асновы пад (ці над) прапускаемай уточнаю ніткай. Стыль ткацтва, што атрымліваецца ў выніку такіх маніпуляцый, быў названы па імені стваральніка прылады, на якой такія тканіны выраблялі.

Жозеф Мары Жакард (1752–1834) у 1804 г. вынайшаў гэтак званы жакардавы ткацкі станок, што дазволіў часткова механізаваць працэс вытворчасці тэкстылю з тканымі ўзорамі і значна паскорыць яго, тым самым зрабіўшы такія тканіны больш таннымі [1]. Асаблівасцю жакардавага станка з'яўляецца магчымасць пры тканні пасля прасоўвання ўточнай ніткі паасобна маніпуляваць кожнай ніткай (групаю нітак) асновы, а менавіта – адвольна апускаць ці падымаць такія ніткі. У выніку атрымліваецца пляценне на тканіне складаных узораў пры любой даўжыні канчатковай прадукцыі.

Гістарычна ўзорыстыя шаўковыя тканіны ў Еўропе называліся «дамаск» – ад назвы аднайменнага сірыйскага горада (лац. *Damascus*), дзе, як прынята лічыць, іх вытворчасць была наладжаная яшчэ ў XI–XII стст. Масавы імпарт дамаска (у Вялікім Княстве Літоўскім назва вымаўлялася як «адамашак» [2]) пачынаецца толькі ў XV ст., а ўжо са стагоддзя XVI і ўласна еўрапейскія тэкстыльныя

мануфактуры, перадусім у Італіі, пачынаюць выраб такіх тканін. На працягу XVI–XVIII стст. адамашак адлюстроўваў раскошу і з’яўляўся модным статусным элементам для шыцця і аздаблення вопраткі, абабівання мэблі ці нават інтэр’ераў парадных памяшканняў. Ужо ў XVIII ст., з прыходам эстэтыкі стылю ракайль, жакардавыя тканіны пачалі паступова выцясняцца тэкстылем з вышытымі ўзорамі ці паліхромнымі роспісамі; разам з тым і тады адамашак ня страціў цалкам сваіх пазіцый, і вялікая колькасць рапортаў жакардавых тканін з узорамі ў стылістыцы ракайля – доказ гэтаму.

Жакардавы арнамент на працягу ўсяго свайго існавання пастаянна змяняўся ў пагоні за моднымі павевамі і адначасова пашыраў свой культурны кантэкст. Як прыклад такога пашырэння можам згадаць шырокае распаўсюджанне ў XVI–XVII стст. мастацкіх выяў спачатку толькі людзей у вопратцы з жакардавымі ўзорамі, пасля – іх жа на фоне сцен, дэкараваных шпалерамі з адамашкавымі арнаментамі. І нарэшце, сам фон такіх карцін стаў адлюстроўвацца ў выглядзе жакарду *(мал. 1)*.

Звяртаючыся да айчыннай спадчыны, трэба зазначыць важную адметнасць беларускіх традыцыйных ікон XVI–XIX стст., а менавіта іх пазалочаны фон – ён таксама пакрываўся разным жакардавым узорам, узятым з арнаментаў адамашку *(мал. 2)*. Пазалочаны разны фон, як прынята лічыць, мае аналогіі ў італьянскім і нямецкім ткацтве XV–XVI стст. [3]. Такое дэкараванне можа разглядацца адначасова ў якасці ўсходняга і заходняга культурных ўплываў, лішні раз пацвярджаючы важнае месца Беларусі як маста і брамы паміж рознымі традыцыямі і цывілізацыямі.

Трэба сказаць, што адамашкавыя матывы знайшлі сваё ўвасабленне нават у геральдыцы: стылістычны прыём, калі каляровае поле ў гербавай кампазіцыі замалёўваецца ўзорам, што ўзнаўляе рапорт узорыстых тканін, акрэсліваецца тэрмінам «дыяпіраванне» (ад англ. *diaper* – узорыстая тканіна, *diapering* – упрыгожваць узорам; не блытайма яго з драпіраваннем – стварэннем дэкаратыўнага эфекту складкамі тканінаў).

Следам за геральдыкай сваё адлюстраванне жакардавыя ўзоры знайшлі ў вексілалагічных аб’ектах – сцягах і прадметах, блізкіх да іх па функцыях: харугвах, вымпелах, транспарантах, штандарах і г.д. Гэтыя і, шырэй, статусныя тэкстыльныя рэчы ў XVI–XVIII стст. на беларускіх землях даволі часта выраблялiся з шаўковых узорыстых тканін. Паводле некаторых падлікаў, на пачатак XVII ст. аб’ём імпарту каштоўнага тэкстылю ў маштабах Рэчы Паспалітай складаў каля 9 млн злотых на год, што было роўным аб’ёму экспарту пшаніцы з краіны за некалькі гадоў. Для Вялікага Княства Літоўскага такі паказчык імпарту быў хаця і меншы, але супастаўны.

## Рапорты як ідэнтыфікацыйны маркер

Спецыфіка жакардавага, тканага ўзору ў апісваемы гістарычны перыяд заключаецца ў тым, што той, па-першае, выступаў у якасці аднаго са сродкаў канкурэнтнай барацьбы паміж тэкстыльнымі мануфактурамі ды з’яўляўся плёнам аўтарскай працы



*Мал. 1.* Партрэт караля Англіі Генрыха VIII мастака Ганса Гальбейна. Вопратка манарха пашытая з адамашку, і сам ён стаіць на фоне насценнай жакардавай шпалеры



*Мал. 2.* Ікона «Цалаванне Яўхіма і Ганны і Звеставанне Багародзіцы», 1640–1650-я гг., з традыцыйным для беларускіх абразоў залатым фонам, на якім адлюстраваны жакардавы ўзор

іх майстроў; па-другое, будучы дэкаратыўным элементам, чуйна рэагаваў на модныя тэндэнцыі і рэгулярна абнаўляўся. З пералічанага, а менавіта – з тэрытарыяльнай непаўторнасці ды зменлівасці ў часавай перспектыве, вынікае надзвычай вялікая колькасць рапортаў (паводле папярэдняга падліку, ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў тысяч), што ператварае ўзоры жакардавых тканін XVI–XVIII стст. у неацэнны ідэнтыфікацыйны маркер у справе атрыбутавання тэкстыльных вырабаў. На падставе параўнання рапортаў можна праводзіць датаванне гістарычных тканін, высвятляць іх паходжанне, удакладняць шляхі імпарту. Сярод падобных ідэнтыфікацыйных маркераў можна прывесці філіграні – вадзяныя знакі на паперы, што адрозніваюцца для розных папяровых вырабнікоў і для розных гадоў.

Вывучэнне гістарычных узорыстых тканін XVI–XVIII стст. дазваляе вылучыць тры асноўныя тыпы кампанавання жакардавых рапортаў на тэкстыльным вырабе *(мал. 3)*:

- *рапорт, які выяўляецца на тканіне без адлюстроўвання;*
- *размешчаны з адлюстроўваннем па падоўжнай восі;*
- *з адлюстроўваннем па падоўжнай і папярочнай восях.*


*Мал. 3.* Тыпы кампаноўкі жакардавых рапортаў

Важнасць рапортаў жакардавых узораў на тканінах у якасці ідэнтыфікацыйнага маркеру можна прасачыць на наступным прыкладзе: у фондах Вайсковага музея (Armemuseum) у Стакгольме (Швецыя), а таксама ў Ваенным архіве (Krigsarkivet) там жа захоўваюцца чатыры харугвы (інвентарныя №№ музея/архіва: AM.084083/AMA.0005353; AM.084081/AMA.0005351; AM.084082/AMA.0005352; -/AMA.0005405), звязаныя з княскім родам Радзівілаў, сярод якіх прынамсі два можна датаваць XVII ст. ды звязаць з асобаю гетмана Вялікага Княства Літоўскага князя Крыштапа Радзівіла Перуна (1547–1603) ці князя Крыштапа Радзівіла (1585–1640), таксама гетмана. Пры гэтым цьмяным застаецца пытанне наконт дакладнай атрыбуцыі гэтых харугваў. З асноўных версіяў можам прывесці дзве.

- *Харугвы ці частка з іх належалі князю Крыштапу Мікалаю Радзівілу Перуну ці камусьці з ранейшых Радзівілаў Біржанскае галіны ды захоўваліся ў Біржанскім (цяпер Біржайскім) замку. Па ўзяцці замка шведамі – ці то ў 1625 г., падчас вайны 1621–1626 гг., ці то ў 1626 г., вайну 1626–1629 гг., – гэтыя харугвы разам з іншымі трафеямі трапілі ў трафейную калекцыю ў Стакгольме, у складзе якой і захоўваюцца па сёння.*
- *Харугвы ці частку з іх неслі на чале гусарскіх атрадаў князя Крыштапа II Радзівіла, польнага гетмана, і яны былі захопленыя шведамі падчас гэтак званай другой бітвы пад Вендэнам (цяпер Цэсіс, Латвія) у 1626 г. і ўжо гэткім чынам апынуліся ў стакгольмскай калекцыі.*

Верагодным можа стацца тое, што частку харугваў захапілі ў Біржанскім замку, а частку – падчас бітвы. Нарэшце, хочацца згадаць і зусім дзіўную ідэю, што грунтуецца на атрыбуцыі адной з харугваў (інв. №AM.084083/AMA.0005353) з 1875 г., дзе яна называецца аўстрыйскай, здабытаю падчас Трыццацігадовай вайны (1618–1648) [4].

Пры тым, што для дакладнай атрыбуцыі харугваў патрабуюцца дадатковыя даследаванні, дэтальнае вывучэнне тканін адной з іх (ужо згаданай «аўстрыйскай») дазволіла высветліць, што рапорты сама менш дзвюх яе шаўковых тканін ідэнтычныя такім на харугве Земскага войска Гродзенскага павету Вялікага Княства Літоўскага; адна з тканін Троцкага павету, у сваю чаргу, ідэнтычная матэрыялу харугвы Гродзенскага павету, які, нарэшце, меў узор тканіны, аднолькавы з узорам з харугвы Слонімскага павету. Да таго ж, знойдзеная пры раскопках у крыпце касцёла св. Мікалая ў г. Гнеў (Польшча) [5] вопратка святара, датаваная перыядам XVI–XVIII стст., мае такі самы рапорт, як на згаданых вышэй харугве князя Крыштапа Радзівіла *(мал. 4)*, а таксама Троцкай харугве [6].

З гэтага мы можам зрабіць высновы: па-першае, відавочна, што тканіны для вырабу харугваў Земскага войска ВКЛ закупляліся цэнтралізавана, па-другое, усе тры павятовыя сімвалы і вопратка каталіцкага святара, пахаванага ў крыпце касцёла св. Мікалая ў Гневе, супадаюць па часе вырабу. Наступнае ўдакладненне храналогіі стварэння любой з пералічаных тэкстыльных рэчаў аўтаматычна дазволіць датаваць і рэшту з іх, а паступовае збіранне датаваных рапортаў тканін у форме спецыялізаванага каталогу дасць магчымасць у будучыні вызначыць дату з'яўлення такіх і падобных вырабаў без дадатковых пошукаў.

## Каталог рапортаў жакардавых узораў на тканінах XVI–XVIII стст.

Прызначэнне гэткага каталогу заключаецца ў акумуляванні рапортаў у выглядзе стандартызаваных картак дзеля наступнага ўвядзення іх у шырокі навуковы ўжытак і выкарыстання ў якасці даведніка.

У кожнай каталогавай картцы павінны змяшчацца:

- ***дакладная графічная выява рапорта, перамаляваная з аўтэнтычнай тканіны*** (ці візуальнай крыніцы з выявай узорыстай тканіны) без скажэння дэталяў і/ці прапорцыяў маштабу рапорта. На выяве рапорта павінны быць спецыяльным чынам пазначаныя незахаваныя і/або ўзноўленыя (рэканструяваныя) часткі;
- ***поўная і дакладная спасылка на крыніцу ўзора з дадатковай інфармацыяй*** (спадарожныя рэчы ды іншыя ідэнтыфікацыйныя прыкметы, колер (колеры) тканіны, тып кампанавання рапорта на тканіне);
- ***для рапортаў, перамаляваных не з аўтэнтычнай тканіны, а з візуальнай крыніцы*** (напрыклад, з жывапіснай карціны з выявою ўзорыстых тканін) павінна змяшчацца выява гэтай першакрыніцы.

Крыніцамі для папаўнення каталогу могуць выступаць экспанаты з айчынных і замежных музейных збораў. Сярод такіх у нашай краіне трэба згадаць перадусім калекцыі Нацыянальнага мастацкага і Нацыянальнага гістарычныга музеяў Беларусі, а сярод замежных – калекцыі тэкстылю музея Метраполітэн у Нью-Ёрку, Музея Вікторыі і Альберта ў Лондане, а таксама ўжо згаданых вышэй Вайсковага музея ў Стакгольме і інш.

## Практычныя прапановы па аднаўленні гістарычных жакардавых тканін

У сучасным свеце, які развіваецца імкліва, тэхналогіі таксама не стаяць на месцы; гэта датычыцца апошніх і ў тэкстыльнай галіне. Вышэй мы ўжо казалі пра вынаходніцтва Жозефам Мары Жакардам ручнога станка, што дазволіў вырабляць жакардавыя тканіны ў вялікіх аб'ёмах. Наступнаю прыступкай па гэтым шляху на сённяшні дзень выступаюць прамысловыя жакардавыя ткацкія станкі з лічбавым праграмным кіраваннем, удзел працы чалавека ў якіх зводзіцца да праграмавання і падрыхтоўкі рапорта ў лічбавым выглядзе ў спецыялізаваных лічбавых фарматах.



*Мал. 4.* Рапорт адной з тканін харугвы князя Крыштапа Радзівіла. Рэканструкцыя аўтара

Сярод лідараў на рынку жакардавых ткацкіх станкоў можам пералічыць фірмы: Bonas Textile Machinery, Charming Star International, Construma, Itema і інш. Трэба сказаць, што выпуск такой прадукцыі быў наладжаны яшчэ ў Савецкім Саюзе на прадпрыемстве «Тэкстыльмаш» (Чэбаксары), станкі гэтага завода мадэльнай лінейкі СТБ могуць выконваць выраб шаўковых жакардавых тканін у прамысловым маштабе. Фактычна на сённяшні дзень не з'яўляецца праблемаю ствараць тэкстыль з тканымі ўзорамі амаль любой складанасці *(мал. 5).*

Праблему ўзнаўлення і вырабу гістарычнай жакардавай тканіны варта падзяліць на падпраблемы:

- *метадалагічна правільнае капіяванне рапорту гістарычнай тканіны;*
- *апрацоўка скапіяванага рапорту і падрыхтоўка яго для праграмавання жакардавага станка.*

Вырашэнне першага пытання палягае ў складанні дакладнай схемы скапіяванага рапорту, чаго можна дамагчыся праз сканаванне аўтэнтычнай тканіны ў вялікім памеры і ў розных рэжымах (каляровым, чорна-белым і да т.п.).

Праца другога этапу заключаецца ў раскладанні выявы рапорту па асобных нітках асновы і ўтку ды складанне рапорта перапляцення тканіны; такі працэс ідэнтычны складанню графічнай матрыцы з двайчным кодам (0/1), дзе кожная ячэйка маркіруе палажэнне ніткі асновы адпаведна над ці пад ніткаю ўтку ў канкрэтнай кропцы пляцення. Наступным ідзе перавод атрыманай матрыцы ў фармат лічбавага файла, прыдатнага для праграмавання наяўнага станка (найбольш распаўсюджанымі фарматамі файлаў з'яўляюцца JC5, EP, UPT, DAT) і загрузка файла ў станок *(мал. 6)*. Важная функцыя некаторых жакардавых ткацкіх станкоў – магчымасць рэдага-



*Мал. 5.* Фрагмент рапорту шаўковай тканіны XVIII ст. Рэканструкцыя аўтара



*Мал. 6.* Дэманстрацыя працэсу перароду рапорту шаўковай тканіны XVIII ст. у графічную матрыцу для праграмавання ткацкага станка

ваць шаблоны рапортаў ужо пасля загрузкі файла з матрыцаю рапорта ў станок, гэта дадае яшчэ адзін пункт – карэктаванне рапорта ў залежнасці ад магчымасцяў канкрэтнага абсталявання. У заключэнне трэба дадаць, што часта абсталяванне (станок) мае функцыю падключэння да WiFi, што дае магчымасць кантраляваць працэс вырабу тканіны аддалена, пры дапамозе смартфона ці кампутара.

Як відаць, гістарычныя тканіны XVI–XVIII стст. з жакардавым узорам – не толькі значная з'ява з мастацтвазнаўчага пункту гледжання і гісторыі развіцця тэкстыльных тэхналогій, але і важны ідэнтыфікацыйны маркер для тэкстыльных вырабаў XVI–XVIII стст. пры ўмове правядзення грунтоўнай працы па складанні каталогу рапортаў.

Сучасныя тэхналогіі (перадусім – праграмаваныя жакардавыя станкі) дазваляюць аднавіць, нават у прамысловых маштабах, жакардавыя тканіны з дакладнымі гістарычнымі малюнкамі рапортаў пры ўмове метадычна правільнай фіксацыі ўзораў ды перанясення іх у адпаведны лічбавы фармат з наступным праграмаваннем жакардавага станка.

Метадычна абгрунтаванае дакладнае ўзнаўленне вырабу гістарычных тканін XVI–XVIII стст. з жакардавымі ўзорамі дазволіць:

- *даць рэстаўратарам тэкстылю матэрыял з арнаментам, ідэнтычным гістарычнаму, для аднаўлення страчаных аўтэнтычных тэкстыльных элементаў;*
- *рэстаўратарам архітэктуры і працаўнікам музеяў прадставіць тканіну, што мае выгляд, адпаведны пэўнаму гістарычнаму перыяду, для магчымасці ўзнавіць гістарычныя інтэр'ерныя элементы (шпалеры, парцьеры, фіранкі, мэблевую абіўку і інш.) і абнавіць музейныя экспазіцыі;*
- *прапанаваць сучаснай айчыннай лёгкай прамысловасці рэсурс для выпуску новых непаўторных тэкстыльных вырабаў самага шырокага ўжытку;*
- *тэхналогія вырабу ўзорыстых тканін можа прывесці да з'яўлення новага мастацтва, дзе аўтар будзе ствараць мастацкі вобраз у лічбавым фармаце, яго пэндзлем будзе выступаць жакардавы праграмаваны станок, а халстом – вырабляемая тканіна.*

Вывучэнне і аналіз рапортаў гістарычных тканін, а таксама выяў з імі дае даследчыку ў рукі новы каштоўны рэсурс для атрыбутавання тэкстыльных вырабаў, роўна як і візуальных крыніц з выявамі ўзорыстага тэкстыльнага матэрыялу, дазваляе прасачыць і ўдакладніць шляхі гандлёва-эканамічных зносін у XVI–XVIII стст.; нарэшце, дапамагае выконваць рэканструкцыю вышэйзгаданых вырабаў дзеля музейнага экспанавання на высокім навуковым узроўні.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Русских М. Жозеф Мари Жаккард. Кибернетика ткацкого ремесла // Радиолоцман. 2012. №2. С. 15–20.
2. Шула-Сянчэўскі А. Рукапісны помнік беларускай лексікаграфіі 1-й паловы XIX ст.: «Словарь Западно-Русскаго нарѣчія прот. І.І. Григоровича» (составленъ 3 іюля (21 іюня) 1851 г.) [літары А, Б, В]. – Мінск, 2023.
3. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў. – Мінск, 1992.
4. Grabowski W. Polskie chorągwie z XVI–XVIII wieku w zbiórach ikonograficznych Armemuseum w Sztokholmie // Dawna broń i barwa. 2000. №23. S. 10.
5. Grupa D. Silk liturgical garments from priest's graves, excavated in St. Nicolas parish church in Gniew // Archaeolinguaa: Series minor. Volume 33. – Budapest, 2013. S. 193–199.
6. Шула-Сянчэўскі А. Сцягі княскага роду Радзівілаў XVI–XX стагоддзяў. – Мінск, 2019.